COUNCIL OF EUROPE CONSEIL DE L'EUROPE

**РАДА ЕЎРОПЫ**
**Камітэт міністраў**

# Рэкамендацыя CM/Rec(2007)14 Камітэта міністраў дзяржавам-удзельніцам аб прававым статусе няўрадавых арганізацый у Еўропе

(Прынятая Камітэтам міністраў 10 кастрычніка 2007 г.
на 1006-м пасяджэнні намеснікаў міністраў)

Камітэт міністраў, згодна з артыкулам 15.б Статута Рады Еўропы,

Прымаючы да ўвагі тое, што мэтай Рады Еўропы з’яўляецца дасягненне большага адзінства паміж яе ўдзельнікамі, і што да гэтай мэты можна ісці шляхам прыняцця агульных правіл;

Усведамляючы істотны ўнёсак няўрадавых арганізацый (НУА) у развіццё і рэалізацыю дэмакратыі і правоў чалавека, у прыватнасці праз спрыянне росту грамадскай свядомасці, удзелу ў грамадскім жыцці і забеспячэнне празрыстасці і падсправаздачнасці дзяржаўных органаў, і не менш важны ўклад НУА ў культурнае жыццё і сацыяльны дабрабыт дэмакратычных грамадстваў;

Прымаючы таксама да ўвагі неацэнны ўнёсак НУА ў дасягненне мэтаў і прынцыпаў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і Статута Рады Еўропы;

З улікам Дэкларацыі і Плана дзеянняў, прынятых на Трэцім саміце кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Савета Еўропы (Варшава, 16-17 мая 2005 г.);

З адзнакай таго, што ўнёсак НУА здзяйсняецца праз надзвычай разнастайную дзейнасць – ад пасярэдніцтва ў камунікацыі паміж рознымі сегментамі грамадства і дзяржаўнымі органамі, прасоўвання зменаў у заканадаўстве і дзяржаўнай палітыцы, аказання дапамогі тым, хто мае ў ёй патрэбу, распрацоўцы тэхнічных і прафесійных стандартаў, маніторынгу выканання існуючых абавязацельстваў у адпаведнасці з нацыянальным і міжнародным заканадаўствам, і да прадастаўлення сродкаў для асабістай рэалізацыі і дасягнення, прасоўвання і абароны агульных інтарэсаў;

Прымаючы да ўвагі, што існаванне многіх НУА з'яўляецца праявай права іх членаў на свабоду аб'яднанняў у адпаведнасці з артыкулам 11

Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама прыняцця іх краінай прынцыпаў дэмакратычнага плюралізму;

Улічваючы артыкул 5 Еўрапейскай сацыяльнай хартыі (перагледжанай) (ETS № 163), артыкулы 3, 7 і 8 Рамкавай канвенцыі аб абароне нацыянальных меншасцяў (ETS № 157) і артыкул 3 Канвенцыі аб удзеле замежнікаў у грамадскім жыцці на мясцовым узроўні (ETS № 144);

Прызнаючы, што дзейнасць НУА цягне за сабой не толькі правы, але і абавязкі;

З улікам таго, што найлепшым сродкам забеспячэння этычных, адказных паводзін НУА з'яўляецца спрыянне іх самарэгуляванню;

Прымаючы ва ўлік прэцэдэнтнае права Еўрапейскага суда па правах чалавека і меркаванні дагаворных органаў ААН па правах чалавека;

Прымаючы да ўвагі Дэкларацыю аб праве і абавязку асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды, Рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый A/RES/53/144;

Абапіраючыся на Фундаментальныя прынцыпы па статусе няўрадавых арганізацый у Еўропе;

Прымаючы да ўвагі Еўрапейскую канвенцыю аб прызнанні правасуб'ектнасці міжнародных няўрадавых арганізацый (ETS № 124) (далей - Канвенцыя № 124) і пажаданасць павелічэння колькасці яе дагаворных бакоў;

Рэкамендуе, каб урады дзяржаў-удзельніц:

– кіраваліся ў сваім заканадаўстве, палітыцы і практыцы мінімальнымі стандартамі, выкладзенымі ў гэтай Рэкамендацыі;

– улічвалі гэтыя стандарты пры маніторынгу ўзятых на сябе абавязацельстваў;

– забяспечвалі, каб гэтая Рэкамендацыя і Тлумачальны мемарандум, які яе суправаджае, былі перакладзеныя і як мага шырэй распаўсюджаныя сярод НУА і грамадскасці ў цэлым, а таксама сярод парламентарыяў, адпаведных дзяржаўных органаў і навучальных устаноў, а таксама выкарыстоўваліся для навучання службовых асоб.

## I. Асноўныя прынцыпы

1. Для мэт дадзенай Рэкамендацыі НУА - гэта добраахвотныя самакіравальныя органы або арганізацыі, створаныя для дасягнення па сутнасці некамерцыйных мэтаў іх заснавальнікаў або членаў. У іх не ўваходзяць палітычныя партыі.

2. Да НУА адносяцца органы або арганізацыі, створаныя як асобамі (фізічнымі або юрыдычнымі), так і групамі такіх асоб. Яны могуць быць створаныя як на членскай аснове, так і без членства.

3. НУА могуць быць як нефармальнымі органамі або арганізацыямі, так і мець статус юрыдычнай асобы.

4. Па складзе і сферы дзейнасці НУА могуць быць нацыянальнымі і міжнароднымі.

5. НУА павінны мець права на свабоду выказвання і ўсімі іншымі гарантаванымі на ўніверсальным і рэгіянальным узроўні правамі і свабодамі, якія іх датычацца.

6. НУА не мусяць падлягаць кіраванню з боку дзяржаўных уладаў.

7. НУА з статусам юрыдычнай асобы павінны мець такія ж паўнамоцтвы, якімі звычайна валодаюць іншыя юрыдычныя асобы, і на іх павінны распаўсюджвацца тыя ж абавязкі і санкцыі, якія накладаюцца адміністрацыйным, грамадзянскім і крымінальным заканадаўствам на гэтыя юрыдычныя асобы.

8. Прававы і фінансавы апарат, які ўжываецца ў дачыненні да НУА, павінен заахвочваць іх стварэнне і працяг дзейнасці.

9. НУА не павінны размяркоўваць прыбыткі, якія могуць узнікнуць у выніку іх дзейнасці, паміж сваімі членамі або заснавальнікамі, але могуць выкарыстоўваць іх для дасягнення сваіх мэтаў.

10. Дзеянні або бяздзейнасць дзяржаўных органаў, якія закранаюць НУА, павінны быць прадметам адміністрацыйнага нагляду і могуць быць абскарджаныя НУА ў незалежным і бесстароннім судзе з поўнай юрысдыкцыяй.

**II. Мэты**

11. НУА павінны мець магчымасць свабодна дасягаць свае мэты пры ўмове, што і самі мэты, і сродкі іх дасягнення адпавядаюць патрабаванням дэмакратычнага грамадства.

12. НУА павінны мець магчымасць свабодна праводзіць даследаванні, адукацыйную дзейнасць і агітацыю па пытаннях, якія належаць да сферы грамадскага абмеркавання, незалежна ад таго, ці адпавядае іх пазіцыя дзяржаўнай палітыцы і ці патрабуе яна зменаў у заканадаўстве.

13. НУА павінны мець магчымасць свабодна падтрымліваць канкрэтнага кандыдата або партыю на выбарах або рэферэндуме пры ўмове, што яны захоўваюць празрыстасць, дэкларуючы свае матывы. Любая такая

падтрымка павінна таксама падпарадкоўвацца заканадаўству аб фінансаванні выбараў і палітычных партый.

14. НУА павінны мець магчымасць свабодна займацца любой законнай эканамічнай, прадпрымальніцкай або камерцыйнай дзейнасцю ў мэтах падтрымкі сваёй некамерцыйнай дзейнасці без неабходнасці атрымання спецыяльнага дазволу, але з улікам любых ліцэнзійных або нарматыўных патрабаванняў, якія звычайна прымяняюцца да адпаведнай дзейнасці.

15. НУА павінны мець магчымасць свабодна дасягаць свае мэты праз членства ў асацыяцыях, федэрацыях і канфедэрацыях НУА, як нацыянальных, так і міжнародных.

## III. Фармаванне і членства

### A. Заснаванне

16. Любая асоба, незалежна ад таго, юрыдычная ці фізічная, са стасусам грамадзяніна ці без яго, альбо група такіх асоб павінна мець магчымасць свабодна ствараць НУА, а ў выпадку НУА, не заснаванай на членстве, павінна мець магчымасць зрабіць гэта шляхам дарэння або завяшчання.

17. Дзве або больш асоб павінны мець магчымасць стварыць НУА, заснаваную на членстве, але пры набыцці статусу юрыдычнай асобы можа патрабавацца большая колькасць асобаў пры ўмове, што гэтая колькасць не ўстаноўлена на ўзроўні, які запабягае заснаванню.

### Б. Статуты

18. НУА, якая з'яўляецца юрыдычнай асобай, павінна як правіла мець статут, які змяшчае ўстаноўчы дакумент або дакумент аб рэгістрацыі і, калі неабходна, любы іншы дакумент, які вызначае ўмовы яе дзейнасці.

19. У статуце НУА, якая з'яўляецца юрыдычнай асобай, як правіла, павінны быць указаныя:

а. яе назва;
б. яе мэты;
в. яе паўнамоцтвы;
d. вышэйшы кіруючы орган;
д. перыядычнасць пасяджэнняў гэтага органа;
е. парадак правядзення такіх пасяджэнняў;
г. спосаб зацвярджэння гэтым органам фінансавай і іншай справаздачнасці;
ч. парадак змены статута і ліквідацыі арганізацыі або далучэння яе да іншай НУА.

20. Вышэйшым кіруючым органам НУА, заснаванай на членстве, павінны быць члены арганізацыі, і іх згода мусіць патрабавацца для прыняцця

любых зменаў у статуце. Для іншых НУА вышэйшым кіруючым органам павінен быць той, які вызначаны ў іх статуце.

**C. Членства**

21. Ніякая асоба не мусіць быць абавязаная паводле закону або іншым чынам прымушацца да ўступлення ў НУА, акрамя органа або арганізацыі, заснаваных паводле закону для рэгулявання прафесійнай дзейнасці ў тых краінах, якія прызнаюць такую арганізацыю як НУА.

22. Здольнасць любой асобы, як фізічнай так і юрыдычнай, як грамадзяніна так і не грамадзяніна краіны, далучацца да НУА, заснаванай на членстве, не павінна празмерна абмяжоўвацца законам і, з улікам забароны на неабгрунтаваную дыскрымінацыю, павінна вызначацца ў першую чаргу статутам адпаведнай НУА.

23. Члены НУА павінны быць абароненыя ад выключэння, якое супярэчыць яе статуту.

24. Асобы, якія належаць да НУА, не павінны падвяргацца ніякім санкцыям з-за іх членства ў арганізацыі. Гэта не павінна выключаць магчымасці прызнання такога членства несумяшчальным з пэўнай пасадай або працай.

25. НУА, заснаваныя на членстве, павінны мець магчымасць дазваляць не членам браць удзел у іх дзейнасці.

**IV. Юрыдычная асоба**

**A. Агульныя заўвагі**

26. Правасуб'ектнасць НУА павінна выразна адрознівацца ад правасуб'ектнасці іх членаў або заснавальнікаў.

27. НУА, створаная шляхам зліцця дзвюх ці больш НУА, павінна быць пераемнікам іх правоў і абавязкаў.

**B. Атрыманне статусу юрыдычнай асобы**

28. Калі гэта не з'яўляецца аўтаматычным наступствам заснавання НУА, правілы, якія рэгулююць атрыманне статусу юрыдычнай асобы, павінны быць сфармуляваныя аб'ектыўна і не павінны пакідацца на адвольнае вырашэнне адпаведнага органа.

29. Правілы атрымання юрыдычнай асобы павінны быць даступныя шырокай грамадскасці, а адпаведны працэс павінен быць зразумелым і задавальняючым.

30. Асобы могуць быць пазбаўленыя права фармаваць НУА са статусам юрыдычнай асобы, калі яны былі асуджаныя за правапарушэнне, якое

паказала, што яны не здольныя фармаваць НУА. Такая дыскваліфікацыя павінна быць прапарцыйнай па аб'ёме і працягласці.

31. Заяўка на стварэнне НУА, заснаванай на членстве, павінна ўключаць у сябе толькі яе статут, адрас і імёны яе заснавальнікаў, дырэктараў, службовых асоб і юрыдычных прадстаўнікоў. У выпадку НУА, не заснаванай на членстве, ад яе можа патрабавацца доказ наяўнасці фінансавых сродкаў для дасягнення яе мэтаў.

32. НУА, заснаваная на членстве, можа звяртацца па атрыманне статусу юрыдычнай асобы толькі пасля таго, як прыняцця рэзалюцыі, якая ўхваляе гэты крок, на сходзе, на які былі запрошаныя ўсе члены.

33. За заяўку на статус юрыдычнай асобы можа спаганяцца плата, але яна не мусіць быць усталяваная на ўзроўні, які перашкаджае падачы заявак.

34. У наданні статусу юрыдычнай асобы можа быць адмоўлена толькі калі не былі прадстаўленыя ўсе ясна прадпісаныя неабходныя дакументы, было выкарыстанае імя, якое відавочна ўводзіць у зман або якое недастаткова адрозніваецца ад імені існуючай фізічнай або юрыдычнай асобы ў дадзенай дзяржаве, або статут уключае ў сябе мэту, якая відавочна не сумяшчаецца з патрабаваннямі дэмакратычнага грамадства.

35. Любая ацэнка прымальнасці мэтаў НУА, якая звяртаецца па статус юрыдычнай асобы, павінна быць заснаваная на добрай інфармаванасці і павазе да паняцця палітычнага плюралізму. Такая ацэнка не павінна кіравацца перадузятымі меркаваннямі.

36. Працэс прыняцця рашэнняў органам, адказным за наданне статусу юрыдычнай асобы, павінен быць незалежным і неперадузятым. Такі орган павінен мець дастатковую колькасць персаналу адпаведнай кваліфікацыі для выканання сваіх функцый.

37. Разумны тэрмін павінен быць прызначаны для прыняцця рашэння аб наданні статусу юрыдычнай асобы або аб адмове ў ім.

38. Усе рашэнні павінны быць даведзеныя да ведама заяўніка, а любая адмова павінна ўключаць пісьмова выкладзеныя прычыны і падлягаць абскарджанню ў незалежным і бесстароннім судзе.

39. Рашэнні аб наданні НУА права на атрыманне фінансавых ці іншых ільготаў павінны прымацца незалежна ад асобаў, звязаных з атрыманнем ёю статусу юрыдычнай асобы, і пажадана іншым органам.

40. Інфармацыя аб наданні НУА статусу юрыдычнай асобы, калі яно не вынікае аўтаматычна з заснавання НУА, павінна быць лёгка даступнай для грамадскасці.

41. Ад НУА не павінна патрабавацца перыядычна аднаўляць рэгістрацыю яе стутусу юрыдычнай асобы.

**C. Філіялы; змены ў статуце**

42. Ад НУА не патрабуецца мець дазвол на адкрыццё філіялаў у той жа краіне ці (з улікам пункта 45 ніжэй) за мяжой.

43. Ад НУА не патрабуецца зацвярджэння дзяржаўнымі органамі ўнясення далейшых зменаў у статут, калі толькі гэтыя змены не тычацца яе назвы або мэты. Выдача такога зацвярджэння павінна рэгулявацца тым жа працэдурным працэсам, што і атрыманне статусу юрыдычнай асобы, але такая змена не павінна цягнуць за сабой патрабаванне заснавання адпаведнай НУА ў якасці новай арганізацыі. Ад НУА можа патрабавацца паведаміць адпаведным органам аб іншых папраўках да яе статуту перш чым яны ўступяць у сілу.

**D. Ліквідацыя юрыдычнай асобы**

44. Юрыдычная асоба НУА можа быць ліквідаваная толькі ў выніку добраахвотных захадаў яе членаў, а ў выпадку НУА, не заснаванай на членстве – яе кіруючага органа, або ў выпадку банкруцтва, працяглай бяздзейнасці або сур'ёзных парушэнняў.

**E. Замежныя НУА**

45. Без парушэння прымяняльнасці артыкулаў, выкладзеных у Канвенцыі № 124 для тых дзяржаў, якія ратыфікавалі гэту Канвенцыю, ад замежных НУА можа патрабавацца атрыманне дазволу на дзейнасць ў прымаючай краіне ў парадку, адпаведным палажэнням пунктаў 28-31 і 33-39 дадзенай Рэкамендацыі. Для гэтай мэты яны не павінны ствараць новую і асобную арганізацыю. Дазвол на дзейнасць можа быць адкліканы толькі ў выпадку банкруцтва, працяглай бяздзейнасці або сур'ёзных парушэнняў.

**V. Кіраванне**

46. Асобы, адказныя за кіраванне НУА, заснаванай на членстве, павінны абірацца або прызначацца вышэйшым кіруючым органам або органам, якому ён дэлегаваў гэтую задачу. Кіраўніцтва НУА, не заснаванай на членстве, павінна прызначацца ў адпаведнасці з яе статутам.

47. НУА павінна забяспечыць, каб яе органы кіравання і прыняцця рашэнняў адпавядалі яе статуту, але ў астатнім яны могуць свабодна вызначаць арганізацыйныя шляхі дасягнення сваіх мэтаў. У прыватнасці, НУА не патрабуецца дазвол дзяржаўных органаў для таго, каб змяніць сваю ўнутраную структуру або правілы.

48. Прызначэнне, абранне або замена службовых асоб, а таксама, пры выкананні пунктаў 22 і 23 дадзенай Рэкамендацыі, прыём або выключэнне членаў павінны быць сферай кампетэнцыі адпаведнай НУА. Аднак супрацоўнікі НУА могуць быць пазбаўленыя права выконваць свае службовыя абавязкі пасля абвінаваўчага прысуду за правапарушэнне,

якое паказала, што яны непрыдатныя для выканання такіх абавязкаў. Такое пазбаўленне праў павінна быць прапарцыйным па сферы прымянення і працягласці.

49. НУА не павінна падлягаць ніякім асаблівым абмежаванням на наяўнасць у іх кіраўніцтве або штаце асобаў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі дадзенай краіны.

## VI. Прыцягненне фінансавых сродкаў, маёмасць і дзяржаўная падтрымка

### А. Прыцягненне фінансавых сродкаў

50. НУА павінна мець права запытваць і атрымліваць фінансаванне - грашовыя або натуральныя ахвяраванні - не толькі ад дзяржаўных органаў у сваёй краіне, але таксама ад інстытуцыйных або індывідуальных донараў, іншай краіны або шматбаковых агенцтваў, падпарадкоўваючыся пры гэтым толькі агульнаму заканадаўству, якое тычыцца мытных правілаў, валютнага абмену і адмывання грошай, а таксама фінансавання выбараў і палітычных партый.

### Б. Маёмасць

51. НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, павінна мець доступ да банкаўскіх паслуг.

52. НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, павінна мець магчымасць падаваць у суд на пакрыццё любой шкоды, нанесенай яе маёмасці.

53. Ад НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, можа патрабавацца дзейнічаць па незалежных рэкамендацыях пры продажы або набыцці зямлі, памяшканняў або іншых буйных актываў, калі яна атрымлівае любую форму дзяржаўнай падтрымкі.

54. НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, не павінна выкарыстоўваць маёмасць, набытую на ўмовах вызвалення ад падаткаў, у мэтах, якія не падлягаюць вызваленню ад падаткаў.

55. НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, можа выкарыстоўваць сваю маёмасць для аплаты працы свайму персаналу, а таксама кампенсаваць усім супрацоўнікам і валанцёрам, якія дзейнічаюць па яе даручэнні, панесеныя пры гэтым выдаткі ў разумных памерах.

56. НУА, якая мае статус юрыдычнай асобы, можа прызначыць пераемніка, які атрымае яе маёмасць у выпадку яе ліквідацыі, але толькі пасля пагашэння яе абавязацельстваў і забеспячэння любых правоў донараў на вяртанне грошай. Аднак у выпадку, калі пераемнік не прызначаны або адпаведная НУА нядаўна атрымала дзяржаўнае фінансаванне або іншую форму падтрымкі, можна запатрабаваць, каб гэтая маёмасць была перададзена іншай НУА або юрыдычнай асобе, якая

найбольш адпавядае яе мэтам, або была выкарыстаная ў гэтых мэтах дзяржавай. Больш за тое, дзяржава можа быць пераемнікам, калі альбо мэты, альбо сродкі, выкарыстаныя НУА для дасягнення гэтых мэтаў, былі прызнаныя непрымальнымі.

**C. Дзяржаўная падтрымка**

57. НУА павінны атрымліваць дапамогу ў здзяйсненні сваіх мэтаў праз дзяржаўнае фінансаванне і іншыя формы падтрымкі, такія як вызваленне ад падатку на прыбытак і іншых падаткаў або пошлін на членскія складкі, сродкі і тавары, атрыманыя ад донараў або дзяржаўных і міжнародных агенцтваў, даходы ад інвестыцый, арэнды, ганарараў, эканамічнай дзейнасці і аперацыяў з маёмасцю, а таксама стымуляванне ахвяраванняў праз падатковыя вылікі або крэдыты.

58. Любая форма дзяржаўнай падтрымкі НУА павінна падпарадкоўвацца дакладным і аб'ектыўным крытэрам.

59. Прырода і бенефіцыяры дзейнасці НУА могуць быць важным фактарам у прыняцці рашэння аб прадстаўленні або непрадстаўленні ёй любой формы дзяржаўнай падтрымкі.

60. Прадстаўленне дзяржаўнай падтрымкі таксама можа залежаць ад прыналежнасці НУА да пэўнай катэгорыі або рэжыму, вызначаных у заканадаўстве або маючых пэўную юрыдычную форму.

61. Істотныя змены ў статуце або дзейнасці НУА могуць прывесці да змены або спынення любой дзяржаўнай падтрымкі.

**VII. Падсправаздачнасць**

**A. Празрыстасць**

62. НУА, якая атрымлівае любую форму дзяржаўнай падтрымкі, можа быць абавязаная штогод падаваць справаздачы аб сваіх рахунках і агляд сваёй дзейнасці ў адпаведны наглядны орган.

63. НУА, якая атрымлівае любую форму дзяржаўнай падтрымкі, можа быць абавязаная паведамляць, якая доля яе сродкаў была выкарыстаная на дзейнасць па прыцягненні сродкаў і на адміністрацыйныя выдаткі.

64. Уся справаздачнасць павінна падлягаць абавязку паважаць правы донараў, бенефіцыяраў і персаналу, а таксама права захоўваць законную канфідэнцыяльнасць бізнесу.

65. НУА, якая атрымлівае любую форму дзяржаўнай падтрымкі, можа быць абавязаная, каб яе рахункі праходзілі праверку ўстановай або асобай, незалежнай ад яе кіраўніцтва.

66. Замежныя НУА павінны падпарадкоўвацца патрабаванням пунктаў 62-65 дадзенай Рэкамендацыі толькі ў дачыненні да іх дзейнасці ў прымаючай краіне.

**Б. Нагляд**

67. Дзейнасць НУА павінна ўважацца законнай пры адсутнасці доказаў адваротнага.

68. Ад НУА можа быць запатрабавана прадставіць яе кнігі бухгалтарскага ўліку, запісы і інфармацыю аб дзейнасці для праверкі органам кантролю, калі яна не выканала патрабаванні да справаздачнасці або калі ёсць разумныя падставы падазраваць, што мелі месца або маюць адбыцца сур'ёзныя парушэнні закона.

69. НУА не павінна падвяргацца ператрусу і канфіскацыі без аб'ектыўных падстаў для прыняцця такіх захадаў і без адпаведнай судовай пастановы.

70. Не павінна адбывацца ніякага знешняга ўмяшання ў дзейнасць НУА, калі толькі не было ўстаноўлена, што адбылося сур'ёзнае парушэнне заканадаўчых патрабаванняў, датычных да НУА, або ёсць разумныя падставы ўважаць, што такое парушэнне мае адбыцца.

71. НУА, як правіла, мусіць мець магчымасць падаваць запыт аб прыпыненні любой адміністрацыйнай меры, ужытай у дачыненні да яе. Адмова ў задавальненні такога запыту можа быць неадкладна аспрэчаная ў судовым парадку.

72. У большасці выпадкаў адпаведнай санкцыяй у адносінах да НУА за парушэнне датычных да яе заканадаўчых патрабаванняў (у тым ліку тых, што тычацца атрымання статусу юрыдычнай асобы) павінна быць простае патрабаванне выправіць парушэнне і/або накладанне адміністрацыйнага, грамадзянскага або крымінальнага спагнання на НУА і/або на асоб, непасрэдна адказных за парушэнне. Спагнанне павінна грунтавацца на дзеючым заканадаўстве і выконваць прынцып прапарцыянальнасці.

73. Замежная НУА павінна падпарадкоўвацца палажэнням пунктаў 68-72 дадзенай Рэкамендацыі толькі ў дачыненні да яе дзейнасці ў прымаючай краіне.

74. Пастанова аб ліквідацыі НУА або, у выпадку замежнай НУА, аб адкліканні дазволу на дзейнасць, павінна быць прынятая судом толькі пры наяўнасці пераканаўчых доказаў таго, што падставы, названыя ў пунктах 44 і 45 дадзенай Рэкамендацыі, былі прысутныя. НУА павінна мець магчымасць неадкладна абскардзіць такую пастанову.

**С. Адказнасць**

75. Службовыя асобы, дырэктары і супрацоўнікі НУА са статусам юрыдычнай асобы не павінны несці асабістую адказнасць за яе

запазычанасці, грашовыя і іншыя абавязацельствы. Тым не менш, яны могуць быць прыцягнутыя да адказнасці перад НУА, трэцімі асобамі або ўсімі імі за невыкананне прафесійных функцыяў або грэбаванне абавязкамі.

## VIII. Удзел у прыняцці рашэнняў

76. Дзяржаўныя і квазідзяржаўныя механізмы на ўсіх узроўнях павінны забяспечваць эфектыўны ўдзел НУА без дыскрымінацыі ў дыялогу і кансультацыях па пытаннях мэтаў і рашэнняў дзяржаўнай палітыкі. Такі ўдзел павінен забяспечваць свабоднае выказванне разнастайных меркаванняў людзей адносна функцыянавання грамадства. Гэтаму ўдзелу і супрацоўніцтву павінна спрыяць забеспячэнне належнага раскрыцця афіцыйнай інфармацыі або доступу да яе.

77. З НУА павінны праводзіцца кансультацыі падчас распрацоўкі першаснага і другаснага заканадаўства, якое закранае іх статус, фінансаванне або сферу дзейнасці.